## ИСТОРИЯ

С.Я. Новікаў

# БІТВА ПАД ГОМЕЛЕМ ЛЕТАМ 1941 ГОДА Ў СВЯТЛЕ НОВЫХ НЯМЕЦКІХ ДАКУМЕНТАЎ

Айчыннаму чытачу ўпершыню прадстаўлены аналіз вынікаў даследавання баявых падзей у ходзе 5-тыднёвай “бітвы пяхоты на ўсходзе”, якая адбывалася на Гомельшчыне ў ліпені – жніўні 1941 года. Аўтар аднаўляе агульную карціну баёў пад Рагачовам і Жлобінам у ходзе контрнаступлення Чырвонай Арміі, а таксама паказвае вынікі нямецкага наступлення на гомельскім напрамку, ставячы ў цэнтр навуковага пошуку новыя дакументальныя крыніцы нямецкага паходжання.

Пасля шматтыднёвых абарончых баёў, якія фактычна ўпершыню ў ходзе германскага “бліцкрыгу” супраць СССР на тэрыторыі Беларусі былі вымушаны весці пяхотныя дывізіі вермахта на Дняпроўскім рубяжы каля Рагачова і Жлобіна ў ліпені – жніўні 1941 г., нямецкая газета „Kölnischer Zeitung“ не шкадавала фарбаў паведамляючы пра тое, што часці сухапутных сіл Германіі пры ўдзеле люфтваффэ правялі маштабную абарончую аперацыю ў раёне беларускіх гарадоў Рагачова і Жлобіна ў ліпені і наступленне пад Рагачовам – Гомелем сіламі 2-й нямецкай палявой арміі ў жніўні 1941 года, названыя для нямецкіх чытачоў “бітвай пяхоты на ўсходзе” [1; Bl. 27].

Паводле айчыннай гістарыяграфіі, контрудар на Рагачоўска-Жлобінскім напрамку быў праведзены 63-м стралковым корпусам (камкор Л.Р. Пятроўскі) 21-й арміі Заходняга (з 24.7.1941 г. Цэнтральнага) фронту з удзелам Жлобінскага і Рагачоўскага знішчальных батальёнаў 13 ліпеня – 17 жніўня; састаўная частка Смаленскай бітвы 1941 г. 6 ліпеня часці 117-й савецкай стралковай дывізіі са складу корпуса пасля разведкі фарсіравалі Дняпро, авалодалі Жлобінам і прасунуліся на захад уздоўж бабруйскай шышы. Гітлераўцы тэрмінова падцягнулі 10-ю матарызаваную і 255-ю пяхотную дывізіі. У выніку жорсткіх баёў савецкія войскі ноччу адарваліся ад праціўніка і адышлі на зыходныя пазіцыі, сарваўшы разлікі нямецкага камандавання з ходу фарсіраваць Дняпро на гэтым участку. 13 ліпеня войскі 21-й арміі перайшлі ў контрнаступленне. 63-і корпус фарсіраваў Дняпро, вызваліў Жлобін (з дапамогай народнага апалчэння), Рагачоў, развіў наступленне на Бабруйск і да канца ліпеня ўклініўся на 30 км у размяшчэнне ворага. Толькі з дапамогай перакінутых сюды 8 дывізій рэзерву нямецкія войскі здолелі замацавацца на заходнім беразе Друці, 14 жніўня прарвалі абарону і зайшлі ў тыл корпуса. З 17 жніўня часці корпуса з баямі пачалі выходзіць з акружэння, пры прарыве з якога быў смяротна паранены камкор Пятроўскі. У выніку контрудару ворагу нанесены значныя страты, 15 яго дывізій былі трывала скаваны ў прасоўванні на ўсход [2; С. 196–197].

Як сведчыць аналіз айчыннай гістарыяграфіі, беларускія гісторыкі да цяперашняга часу па розных прычынах пакуль не правялі завершанага спецыяльнага даследавання[1] тых падзей з выкарыстаннем шырокай базы дакументальных крыніц, у тым ліку нямецкага паходжання [3; С. 517–518].

У нашым даследаванні асновай навуковага пошуку з'яўляюцца нямецкія дакументы, якія патрабуюць крытычнага падыходу, аналізу ў плане параўнання з іншымі дакументамі[2] і матэрыяламі, а таксама ўзважанай ацэнкі кожнага з выяўленых дакументальных фактаў.

Адразу спынімся на некаторых момантах ліпеньскай наступальнай аперацыі Чырвонай Арміі на бабруйскім напрамку і аператыўных дзеяннях з боку немцаў у ходзе вядзення абарончых баёў пад Жлобінам – Рагачовам з 13 па 17 ліпеня 1941 г. [1; Bl. 26]. Як вядома, камандаванне Заходняга фронту, дзеля таго каб адцягнуць сілы праціўніка і аслабіць ціск войска групы армій "Цэнтр" на смаленскім напрамку, на якім з 10 ліпеня 1941 года праводзілася стратэгічная абарончая аперацыя Чырвонай Арміі, з 13 ліпеня па патрабаванні Стаўкі Вярхоўнага Камандавання распачало правядзенне Рагачоўска-Жлобінскай франтавой наступальнай аперацыі сіламі 63-га стралковага корпуса 21-й арміі [4; С. 299–301]. Тое баявое наступленне і яго наступствы, як сцвярджаецца ў сучаснай айчыннай гістарыяграфіі, з'яўляліся, магчыма, першым поспехам за ўвесь пачатковы перыяд вайны [5; С. 47]. На наш погляд, важным можна лічыць таксама і той факт, што ў выніку франтальнай наступальнай аперацыі Чырвонай Арміі нямецкія войскі групы армій "Цэнтр" вымушаны былі перайсці да абароны на тэрыторыі Беларусі значна раней, чым гэта было вызначана самім фюрэрам у канцы ліпеня 1941 г.

Аналіз нямецкіх дакументаў, пакінутых 255-й пяхотнай дывізіяй, аб выніках абарончых баёў пад Рагачовам і Жлобінам пераканаўча сведчыць пра тое, што на гэтым напрамку Чырвоная Армія сканцэнтравала даволі значныя сілы, якія вядуць упартыя баі і жорстка абараняюцца, дэманструючы прыклады храбрасці [1; Bl. 26]. Пры гэтым немцам не ўдалося выявіць рэальную колькасць наступаючых савецкіх часцей.

Пачаткам 5-тыднёвай гісторыі "бітвы пяхоты на ўсходзе" з'явіліся абарончыя дзеянні нямецкай пяхоты пад Рагачовам і Жлобінам у сярэдзіне ліпеня 1941 года. Вывучэнне дакументальных матэрыялаў 255-й нямецкай дывізіі дае падставы для сцвярджэння, што яна з'ўлялася выканаўцам загада аб забеспячэнні баявых дзеянняў на фронце наступлення 167-й савецкай стралковай дывізіі, якая на той момант прыкрывала з захаду Рагачоў [6; Bl. 1–18]. Пачынаючы з 13 ліпеня 1941 г. нямецкі пяхотны полк на працягу тыдня быў вымушаны весці ўпартыя баі на абарончым плацдарме ў раёне Рагачова на рубяжы абароны ад Рагачова на поўначы і да Лучына на поўдні (галоўным

---

[1] Важны першы крок у гэтым напрамку зроблены саіскальнікам аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін ДНУ "Інстытут гісторыі" НАН Беларусі Паўлам Ждановічам. Гл. : *Жданович, П.* Боевые действия 21-й армии на территории Беларуси летом 1941 года / П. Жданович // Гісторыка-археалагічны зборнік. Вып. 24. – Мінск, 2008. – С. 142–151.

[2] Толькі апошнім часам сталі даступнымі некаторыя дакументальныя матэрыялы з фондаў Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны ў г. Падольску. Напрыклад: Уроки Жлобинской операции: Материалы расследования причин поражения 117-й стрелковой дивизии 21-й армии Западного фронта в боях под Жлобином 6 июля 1941 года [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.rkka.ru/docs/spv/SPV6.htm. – Дата доступу : 10.02.2012.

чынам паўздоўж чыгуначнага палатна, а таксама супраць палявых умацаванняў у раёне вёсак Хапаны, Святое, Скачкі на поўначы да Хвойні і Клічы – на поўдні). Праз 5 дзён нямецкія пазіцыі былі адсунуты назад на рубеж вёсак Ясінаўка, Новаселле, Забалоцце, Клучы, Дуброўка [6; Anlage 1].

З палкавога данясення вынікае, што ў выніку 6-дзённай абароны савецкае наступленне з удзелам даволі моцных сіл пацярпела правал. Лінія наступлення цалкам занята і ўмацавана. Пры гэтым полк трымае абарону на ўчастку шырынёй каля 18 км. За гэты час па фронту атакавалі сілы агульнай колькасцю каля 6 савецкіх стралковых палкоў. У выніку баявых дзеянняў за 6 дзён патрапіў у нямецкі палон 331 чырвонаармеец. Па нямецкіх даных, страты, панесеныя савецкімі часцямі на баявым плацдарме, пераўзыходзяць згадаую лічбу не менш чым у 10 разоў. Даволі значныя страты панесены і нямецкім бокам. Як зафіксавана ў данясенні 255-й пяхотнай дывізіі, за 6 дзён абароны былі страчаны 418 афіцэраў, унтэрафіцэраў і радавых [6, Bl. 1; 7, Bl. 1].

За гэты час на фронце абароны 255-й дывізіі на працягу пяці дзён і начэй прыйшлося адбіць звыш за 25 толькі моцных атак сіламі батальёна ці палка [1; Bl. 26]. На асобных участках наступленне вялося сіламі адной-дзвюх савецкіх рот. Пры гэтым колькасць апошніх атак была значна большай, паколькі адна атака ішла за другой, што ў асобных падраздзяленнях іх частата цяжка давалася агульнаму падліку на працягу нават аднаго дня, асабліва пры правядзенні атак 2–3 хвалямі, па некалькі разоў запар. Да таго ж было спынена 12 артылерыйскіх падрыхтовак [6, Bl. 17]. З дакумента вынікае, што савецкая артылерыя вяла эфектыўны агонь. Немцы адзначалі манеўранае вядзенне агню, падкрэслівалі яго значную баявую моц, выкарыстанне вялікай колькасці снарадаў [1; Bl. 26].

У армейскім данясенні аб ходзе правядзення наступальнай аперацыі адзначаецца, што 12 жніўня пачалося наступленне ўсіх вышэйзгаданых нямецкіх часцей за выключэннем 52-й і 255-й пяхотных дывізій, якія павінны былі выконваць задачу па прарыве лініі абароны каля Рагачова і Жлобіна, дзе паўздоўж чыгуначнага палатна па фронту і на флангах знаходзіліся моцна абсталяваныя ўмацаванні 61-й, 154-й і 167-й савецкіх стралковых дывізій. Толькі на трэці дзень пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі і выкарыстання авіяцыі па савецкіх умацаваных пазіцыях у раёне Жлобіна пачала наступленне 255-я пяхотная дывізія. Праціўнік упарта супраціўляўся, для чаго спатрэбілася новае выкарыстанне штурмавой авіяцыі, пасля чаго горад удалося захапіць і прасунуцца да Дняпра [9; Bl. 9].

Паводле армейскага “Данясення аб бітве пад Рагачовам – Гомелем”, на наступны дзень, 16 жніўня, савецкія часці, акружаныя ў раёне Жлобіна – Гарадца – Старой Рудні паспрабавалі вырвацца адразу ў двух напрамках: на поўдзень і паўднёвы ўсход. Нямецкія часці не здолелі перашкодзіць гэтаму, таму ў шматлікіх месцах рускім удалося вырвацца з акружэння.

Паводле данясення, 21-я армія была ліквідавана ў раёне паміж Прапойскам (Слаўгарадам. – С.Н.) – Рагачовам і Жлобінам. У ходзе правядзення аперацыі ў палон быў узяты 5 4081 савецкі ваеннапалонны, а таксама значныя трафеі: 468 гармат, 106 танкаў, 362 кулямёты, 7 самалётаў і шмат іншых трафеяў. У выніку гэтага ўдалося зняць небяспеку для паўднёвага фланга групы армій “Цэнтр” [8; Bl. 14].

У нямецкім дакуменце сустракаюцца звесткі не толькі аб ліквідацыі трох савецкіх дывізій 63-га стралковага корпуса, але і згадваецца факт гібелі яго камандзіра – легендарнага генерала Пятроўскага. Апрача таго канстатуецца, што загінуў камандзір 154-й стралковай дывізіі, быў моцна паранены камандзір 61-й дывізіі; узяты ў палон начальнік штаба корпуса палкоўнік Файгін [9; Bl. 3].

На ўчастку наступлення 53-га нямецкага армейскага корпуса ў палон патрапілі 95 савецкіх афіцэраў, 1 камісар і 21 367 сяржантаў і радавых. Уласныя страты немцаў у корпусе складалі: 408 забітымі, параненымі і зніклымі, да таго ж 13 афіцэраў [7; Bl. 4]. З "Данясення аб бітве пад Рагачовам – Гомелем" вынікае, што ў ходзе правядзення наступальнай аперацыі агульная колькасць страт з нямецкага боку складала 5 190 чалавек, у тым ліку: забітымі – 1 468, з якіх 62 афіцэры; раненымі – 3 367 чалавек, з іх 131 афіцэр; зніклі без вестак – 355 чалавек, у тым ліку 3 афіцэры [8; Bl. 16].

Такім чынам, і на аснове нямецкіх крыніц пакуль не ўдаецца ўзнавіць поўную карціну двухбаковых баявых дзеянняў у ходзе "бітвы пяхоты" пад Жлобінам, Рагачовам і Гомелем. Адчуваецца недахоп крыніц, з-за чаго некаторыя эпізоды тых падзей пакуль выглядаюць фрагментарна. Між тым наша першае знаёмства з нямецкімі дакументальнымі крыніцамі, у якіх утрымліваюцца малавядомыя звесткі аб баявых падзеях на гомельскім напрамку абароны Заходняга і Цэнтральнага франтоў летам 1941 года, ставіць на парадак дня айчыннай гістарычнай навукі задачу па максімальна поўным выкарыстанні дадатковых дакументаў, у тым ліку нямецкага паходжання, для аб'ектыўнага паказу падзей баявой гісторыі Беларусі ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

ЛІТАРАТУРА


1. Федэральны ваенны архіў Германіі (далей BA-MA). – RH 26–255/27: Gefechtsbericht über die Abwehrschlacht bei Rogatschew – Gomel.
2. *Лемяшонак, У.І.* Рагачоўска-Жлобінская аперацыя / У.І. Лемяшонак. – Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / Рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 2001. – Т. 13.
3. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А.А. Коваленя (руководитель авторского коллектива), А.М. Литвин, В.И. Кузьменко [и др.] – Минск : БЕЛТА, 2005. – 544 с.
4. Боевой приказ № 03/ОП. Штарм 21 Гомель. 13.7.41 // *Иринархов, Р.С.* Агония 1941 года. Кровавые дороги отступления / Р.В. Иринархов. – М. : Яуза : Эксмо, 2011. – 544 с.
5. *Литвин, А.М.* В боях за восточную Беларусь / А.М. Литвин // Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память : в 2 кн. / НАН Беларуси, Ин-т истории ; редкол. : А.А. Коваленя (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. Кн. 1 – 480 с.
6. BA-MA. – RH 26–255/27: Gefechtsbericht des I.R. 475 über die Kämpfe bei Rogatschew vom 13.–19.7.1941 (mit Anlagen 1–16).
7. RH 20–2/172b: Kurzer Bericht über die Tätigkeit des LIII. A.K. in der Schlacht von Rogatschew – Gomel vom 14.8. – 19.8.41.
8. BA-MA. – RH 20–2/172b: Bericht über die Schlacht von Rogatschew – Gomel, v. 13.9.41.
9. BA-MA. – RH 20–2/172b: Tätigkeitsbericht des XXXXIII. A.K. bei Einleitung und Durchführung der Schlacht bei Gomel.


*Поступила в редакцию 13.02.12*